Іванова А.А., студ. гр. 414 а ФТБК і СМ БДУКМ
Навуковы кіраўнік –Аляхновіч А.М., кандыдат філалагічных навук, прафесар

# ДА ПЫТАННЯ ЭСТЭТЫКІ СУЧАСНАГА НАРОДНАГА СВЯТА

Агульнавядома, што эстэтыка сучаснага народнага свята недастаткова асвятляяецца ў навуковай літаратуры. У той жа час у народным свяце мастацкая эстэтычная функцыя набывае першаснае значэнне, становіцца вядучай.Астатнія функцыі (магічная, этычная, камунікатыўная і інш.) нівіліруюцца, уступаючы месца эстэтычнай. Менавіта гэтым вызначаецца актуальнасць разглядаемага пытання.

Этымалогія слова "эстэтыка" паходзіць ад стар.-грэч. αἰσθητικός (пачуццёвы), ад αἴσθημα — (пачуцце, пачуццёвае ўспрыманне) — навука, якая вывучае прыроду эстэтычнай свядомасці (функцыі, нормы, агульныя законы і заканамернасці дзейнасці людзей і супольніцтваў). Упершыню *эстэтыка* як тэрмін быў ўжыты Баўмгартэнам ў 1735 г. для вызначэння стратэгіі даследвання пачуццёвых ведаў. Першапачаткова ў эстэтыцы вывучаліся здольнасці пачуццёвага пазнання, але з цягам часу яна распаўсюдзілася не толькі на творы мастацтва, але і на прыроду, і на сферу чалавечых узаемаадносін.

Да пытання эстэтыкі звярталіся многія даследчыкі мінулага: Арыстоцель, Гегель, Спенсер, Шапэнгауэр і іншыя. Найбольш актуальнай для нашага даследвання з'яўляецца праца Н.Г. Чарнышэўскага "Эстэтычныя адносіны мастацтва да рэчаіснасці", у якой ён адзначаў, што "эстэтыка фальклора –гэта эстэтыка калектыўнай творчасці. Яна адлюстроўвае калектыўна выпрацаваныя, шырока прынятыя народнымі масамі традыцыйныя ўяўленні аб выдатным і брыдкім, аб узнёслым і нізменным, аб трагічным і камічным. У фальклоры непасрэдна ўвасабляецца эстэтычны ідэал мас, або дакладней –розных сацыяльных калектываў, складаючых народ, на розных стадыях яго эстэтычнага развіцця."[6, 42] Агульнавядома,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што фальклор –гэта аснова народнага свята, галоўны кампанент абрадавай святочнай дзеі, што абавязвае да спецыяльнага разгляду фальклору як крыніцы пазнання эстэтычнай свядомасці і эстэтычных густаў народа. Нельга не пагадзіцца з Н. Г. Чарнышэскім, які пісаў, што “сіла і хараство эстэтычнага ўздзеяння фальклору–у той непасрэднай рэакцыі, якая ўзнікае ў слухача і гледача ў самы момант выканання твора, асабліва, калі гэтае выкананне набывае характар імправізацыі.” [6, 44]

Не меньш цікавай думкай адносна існавання фальклору, яго выхаваўчай функцыі з’яўляецца метадалагічнае палажэнне даследчыка В. Е. Гусева, які сцвярджае, што “фальклор існуе перш за усё для саміх яго творцаў і выканаўцаў, для саміх мас, і толькі потым для гледачоў і слухачоў. Адзінства … аб’екта і суб’екта эстэтычнага перажывання –адно з цудоўных якасцей фальклору. Таму эстэтычны крытэрый для вызначэння эстэтычнай каштоўнасці твораў фальклору знаходзіцца ў ім самім.” [3, 57]

Калі звярнуцца да адлюстравання эстэтыкі ў сучасным свяце, то можна заўважыць, што галоўным недахопам з’яўляецца тое, что губляецца тая самая жыццёвая праўда, на якую звярталі ўвагу ў сваіх даследваннях узгаданыя намі вышэй, Н. Г. Чарнышэўскі і В. Е. Гусеў. Таму задача рэжысёра -максімальна наблізіць сцэнічныя абрадавыя дзеі да рэальнага жыцця.

Разгледзім увасабленне эстэтыкі, якая праяўляецца ў асноўных рытуальных дзеях Купалля.

Так, разглядаючы збор кветак і траў дзяўчатамі на Купалле, этнограф П.А. Гуд слушна заўваважае: “Акрамя практычнага значэння, збор кветак і траў нясе ў сябе яшчэ і эстэтычную функцыю: у час падрыхтоўкі да свята плялі вянкі і ўпрыгожвалі сябе зелянінай, падпярэзваліся перавяслам з кветак і зёлак. Вянкі ў далейшым былі прадметам варажбы аб лёсе, таму кожная дзяўчына імкнулася сплесці свой вянок і перавясла лепей за іншых.” [2, 26]

Купальская варажба на вянках мела багаты эстэтычны змест. Можна сабе ўявіць, як хараство зелянiны запаўняла ўсю прастору святкавання: па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

святочнаму прыбраных дзяўчат у вянках з living рознакаляровых кветак, “люстэрка” ракі, пышны зялёны убор яе берагоў, вясковы люд, што прыйшоў паназіраць за прыгожым дзействам.

Вельмі відовішчным эстэтычным аспектам купальскага свята з’яўляецца шэсцэ, у якім праяўляецца эстэтыка абрадавай дзеі. Галоўнай мэтай купальскага шэсця было актыўнае далучэнне да свята ўсіх жыхароў вёскі. Усе –ад мала да вяліка –апраналіся ў самае лепшае, святочнае, адзенне, упрыгожвалі сябе зелянінай, вянкамі, падпярэзваліся палыном, запальвалі доўгія кіі, –і толькі пасля гэтага станавіліся паўнапраўнымі ўдзельнікамі агульнага шэсця. Не пайсці на шэсце значыла не удзельнічаць у магічных абрадах Купалля і тым самым не спрыяць дабрабыту людзей, урадлівасці поля, пладавітасці жывёлы.

Важным момантам падрыхтоўкі купальскага свята з’яўляўся выбар месца дзеяння, яго мастацкае афармленне і раскладанне вогнішча. Сама прырода несла эстэтычны падтэкст і падказвала месца правядзення свята. Так, вогнішча звычайна раскладвалі на пагорках, каб яно было бачна здалёк. Лічылася, што чым большую плошчу асвеціць полымя вогнішча, тым больш шчодра сонца будзе саграваць і асвятляць зямлю.

Трэба адзначыць, што эстэтыка рытуальных дзей Купалля асабліва раскрываецца ў рэгіянальных адметнасцях. Так, у раёнах Усходняй Беларусі паверх драўлянага шаста, усталяванага ў цэнтры вогнішча, прывязвалі пук або сноп саломы. Першапачаткова рытуальна-магічную семантыку такой канструкцыі можна растлумачыць верай людзей ў неабходнасць знішчэння рознай непатрэбшчыны, і, ў прыватнасц,і саломы, пазбаўленай зерня як аплаадняльнага пачатку. А у Віцебскай губерні існаваў звычай пускаць запаленыя колы з гары, што сімвалізавала убыванне сонца з лета на зіму. Таксама эстэтычнае адценне праяўляецца ў танцах -агульнанацыянальных элементах купальскіх гульбішчаў, характэрных для большасці раёнаў Беларусі, а таксама ў пераскокваннях праз палаючае вогнішча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Што тычыцца купальскіх песень, то іх эстэтыка праяўляецца ў тых мастацка-вобразных сродках, якімі яны насычаны. Размова ідзе пра выкарыстанне паэтычных сродкаў: метафар, зваротаў, памяншальна-ласкальных назоўнікаў, параўнанняў, псіхалагічных паралелізмаў, што стварала асобны эмацыянальны настрой і надавала эстэтычны каларыт ўспрыняцця рытуальных дзей: (*"Ішла Купала сялом, сялом, // Закрыўшы вочы пяром, пяром. // На Йвана Купала, на Йвана Купала! // Закрыўшы вочы пяром, пяром, // Вітала хлопцаў чалом, чалом, // Вітала хлопцаў чалом, чалом. // Свяціла ночкі агнём, агнём, // Свяціла ночкі агнём, агнём. // Пляла вяночкі шаўком, шаўком, // Пляла вяночкі шаўком, шаўком. // Слыла Купалка цяплом, дабром, // Слыла Купалка цяплом, дабром. // Славу Купалу пяём, пяём")* [1, 61]

Для купальскай паэзіі ў цэлым характэрны светлы, аптымістычны каларыт. Яна святочная сваім зместам, агульным настроем. У саміх абрадавых песнях народ заўсёды чэрпаў вялікую эстэтычную асалоду, паколькі меў чуткі слых да прыгажосці паэтычнага слова. Гэта значыць, што песенная эстэтыка з'яўляецца творчай патрэбай душы і аўтараў, і выканаўцаў песень, і слухачоў.

У народным свяце рэжысёр павінен галоўную ўвагу ўдзяляць эстэтыцы рытуальных дзей, таму што сучаснага чалавека, асабліва моладзь, у абрадава-святочнай культуры цікавіць менавіта жыццёвая праўда, але на новым, эстэтычным узроўні ўспрыняцця і разумення. Рэжысёр абавязан імкнуцца прывесці рытуальные дзеі да эстэтычнага выгляду, а таксама мець на ўвазе тое, што гледачу непажадана бачыць на сцэне прымітывізм і вульгарызм увасаблення рытуальных дзей. Пры стварэнні сучаснага народнага свята рэжысёру неабходна ўлічваць і тое, што святочная абрадавая культура страціла магічную функцыю і набыла эстэтычнае харацтво. Вобразнае эстэтычнае мысленне рэжысёра пры ўзнаўленні народнага свята павінна напаўняць усю мастацкую палітру святочнай дзеі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, эстэтыка сучаснага народнага свята павінна мець закончаную форму, адрознівацца логікай пабудовы і пранізваць усе дзеі свята. Дзеля глыбокага эстэтычнага напаўнення сучаснага свята рэжысёру неабходна ўлічваць многія элементы, пачынаючы ад месца правядзення свята і напісання якаснага сцэнарыю да выбару якаснага песеннага рэпертуару і прыгожа афармленых касцюмаў ўдзельнікаў.

Спіс выкарыстанай літаратуры:


1. Беларуская народная творчасць. Купальскія і пятроўскія песні . – Мн.: Навука і тэхніка, 1985, с. 629.
2. Гуд, П.А. Беларускае Купалле: кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей. –Мн. : БУК, 1999., с.134.
3. Гусев, В. Е. Эстетика фольклора.–Л. : «Наука», Ленингр.отделение, 1967, с.319.
4. Гильберт, К., Кун, Г. История эстетики. –М., 1960, с. 233.
5. Роднае слова / Заснав. : М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. –Мн. : ДП “Дом прэсы”, 1992.
6. Чернышевский, Н. Г. Статьи по эстетике. –М., 1938, с. 175.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ